Уладзімер Арлоў

Усё па-ранейшаму толькі імёны зьмяніліся

вершы

Мінск/ Логвінаў/ 2009

Полацак

у даўкім віне
восеньскага паветра
іду па бруку
сярод старых камяніц
пад сьцягам адзіноты

Апошняя жанчына Казановы

Сьвятлане й Алесю

потым ён пазіраў у столь
пакуль яна ціха плакала
глядзела на акуратную плямку
памерам зь вішню гэткага ж колеру
кратала яе пальчыкам
павольна апраналася

потым ён сказаў
запомні дзіця маё
быць жанчынаю значыць умець
уцякаць так каб цябе злавілі
яна зноў заплакала
каб высушыць яе сьлёзы ён працягваў
а ўзаемнасьць гэта калі любіш сябе

потым яшчэ адчуваючы
козыт яе залатога руна
халаднаваты згустак яе цела
сьвежага як адпрасаваная кашуля
ён думаў
Даротка
апэтытная чарнявая козачка
дваццаць адзін год
дачка замкавага прыбрамніка
такіх выпраўляюць у плаваньне
гадоў у дванаццаць
хто б мог уявіць

потым ён адчыніў вакно
падаў надакучлівы багемскі дождж
але мокрая лістота панядзелка
пахла лепей за рэчыва якім у пятніцу

нехта намаляваў ягоны партрэт
што прыляпілі тым самым рэчывам

да сьцяны гарадзкой прыбіральні
гаўняны мастак меў несумнеўныя здольнасьці

потым сэрца сьціснулася ад згадкі пра
ўлюбёнага сабаку якога забілі ў суботу
падкінуўшы яшчэ цёплага яму пад дзьверы
але ўчарашняя думка пра самагубства
ўжо згарэла ў каміне
разам з балючым успамінам аб тым
як учора з нагоды нядзелі
фаварыт замкавага аканома зьбіў яго
Джакома Казанову
знаёмага з каралямі ды імпэратарамі
сукаватым друкам пасярод вуліцы
Даротка — цудоўны рэванш калі табе 66

потым быў судовы працэс
у напятай вусьцішы Даротка абвясьціла што
яе пазбавіў нявіннасьці
не бібліятэкар графа Вальдштайна
Джакома Казанова
як сьцьвярджаюць розныя недасьведчаныя асобы
а малады мастак які два тыдні таму
ўцёк нягоднік у Італію
фаварыт аканома гучна вылаяўся а ён зразумеў
што не згадае дачку прыбрамніка ў мэмуарах
дзе між іншага піша пра ўсіх сваіх жанчын
памятаючы кожную на імя на вусны на лоні

потым ён вярнуўся да запаветнага манускрыпту
каб схіляцца над ім яшчэ сем гадоў
3700 старонак і толькі трацiна пра любоўныя гульні
47 італіек (ён быў патрыётам)
19 француженак 10 швайцарак
24 служанкі (ён быў дэмакратам)
18 дам высакароднага паходжаньня
7 актрак 1 рабыня (дала б фору тром графіням)
3 манашкі (ён быў хрысьціянінам)
уласная даруй Божа пляменьніца etc.

потым ён памёр
круцячы катрынку ўспамінаў
думаючы што патрэба кахаць
гэтаксама як патрэба быць каханым —
праява чалавечага эгаізму
згадваючы Даротку
гэта здарылася ў ягоным фатэлі
ложак быў толькі крышачку даўжэйшы
у тыя часы спалі амаль седзячы
каб адпалохваць сьмерць
быццам яна ня ведае гэткіх хітрыкаў

потым Даротка выйшла замуж
праславілася сярод сяброўак сваёй мудрасьцю
бо ўмела да месца сказаць сэнтэнцыю
пачутую ад колішняга графскага бібліятэкара
ня варта распранацца там дзе няварта распранацца
або
калі ваш муж рагаты гэта ня значыць што ён д’ябал
часам у яе пыталіся што чуваць пра
ейнага першага мужчыну які ўцёк у Італію
тады на Даротчыных вуснах
доўга ня гасла цёплая ўсьмешка

потым я пытаўся колькі жанчын было ў Казановы
10 000 не задумваючыся адказаў адзін сябар
365 пасьля складаных падлікаў падсумаваў другі
900 летуценна ўзьняла вочы адна знаёмая
20 засьмяялася другая апынуўшыся найбліжэй да праўды
дадай 112 сказаў я і яшчэ Даротку

потым я прыехаў у замак Вальдштайнаў у Духцаве
цяпер гэта Чэхія
там усё засталося па-ранейшаму
няма толькі партрэту ў прыбіральні
а шкада бо пах выветрыўся дзьвесьце гадоў таму
затое ў замку павесілі празрыстую паштовую скрынку
НАПІШЫЦЕ КАЗАНОВУ І ЁН ВАМ АДКАЖА

поўную лістоў з жаночымі імёнамі й дакладнымі адрасамі
усе спрэс па-расейску
потым я зайшоў у пансіён КАЗАНОВА
замовіў келіх франкоўкі
нейкі пструг на рошту з брамбарамі
разгарнуў нататнік і напісаў
потым ён пазіраў у столь

потым я прачытаў імя чарнявай афіцыянткі
Даротка

потым я пазіраў у столь

Вецер

вецер — ды гэта ўсяго толькі розьніца ціскаў
дзе тая дзева якую за школай ты ціскаў?
жыць — гэта йсьці супраць ветру адкрыўшы забрала?
дзе тая рэчка што ледзьве цябе не забрала?

дзева памерла пасьпеўшы паняньчыць унука
рэчка зьніцела — сама без усякай прынукі
ты паглядзіш у яе перасохлае люстра
нешта згадаеш з таго што казаў Заратустра

можа вось гэта: адны паміраюць зарана
ну а другія запозна… адкрыецца рана
ў памяці соннай зьнячэўку: філёзаф засраны!
як яе клікалі? Аня… Ганулечка… Ганна!

It’s all the same...

Яну Максімюку

у паўпустым вечаровым мэтро
зь ленаватым позехам жніўня
і рэклямаю контрацэптываў
ператвараесься ў гледача
вандроўнага тэатру на рэйках

у спэктаклі занятыя
дзьве парачкі закаханых
зусім юная і сталая
з заручальнымі пярсьцёнкамі
відавочна падараванымі
не адно аднаму
былы паэт а цяпер
пітушчы ціхі вар’ят
з пляшкаю ў кішэні
маладая мама зь немаўлёнкам
хлопец з плэерам

юныя закаханыя
ўзасмокт цалуюцца
сталыя пераплятаюцца пальцамі
былы паэт выцягвае ня пляшку
а зашмальцаваную кніжку
немаўлёнак шукае цыцу
хлопец умыкае плэер

інтрыга залежыць
ад тваёй фантазіі
уладальнік плэера
пазнае ў адным з каханкаў
роднага бацьку

былы паэт пазнае
ў спадарожніцы апазнанага бацькі
сваё першае каханьне
ты пазнаеш песьню Бон Джові

it’s all the same...
юная закаханая
пазнае ў гаспадару плэера
таго хто ўвесну
пазбавіў яе нявіннасьці
only the names have changed...
немаўлёнак пазнае пакуль
толькі маміны цыцы
якія здаецца не пазнае
ніводны з астатніх прысутных
улучна з табой

it’s all the same
only the names have changed...
сьпявае Бон Джові
словы нарэшце даплываюць
да тваe сьвядомасьці
усё па-ранейшаму
толькі імёны зьмяніліся...
клясная песьня думаеш ты
усьцешана ўяўляючы як

гадоў праз семдзесят пяць
у гэтым мэтро зноў
будзе ехаць вечар
у кампаніі з жніўнем
і сёньняшні немаўлёнак
(адзіны у каго ня зьменіцца імя)
зьявіцца на сцэне ў ролі
былога паэта
(калі бываюць былыя паэты)
з пляшкаю і

зашмальцаванай кніжкаю
(калі тады яшчэ будуць кніжкі
якія можна зашмальцаваць)
а нейкі маладзён умкне
які-небудзь тагачасны плэер
што дзівам захавае мэлёдыю

якая цяпер атручвае цябе
неадольным аптымізмам

і ты ўжо вераш быццам
пакуль на тваім месцы ўладкуецца
хтосьці зь іншым імем
яшчэ пасьпееш стварыць
геніяльны раман
наведаць Новую Зэляндыю
а таксама
выпіць зь Міланам Кундэрам
дасхочу нагаварыўшыся зь ім
пра гэтую невыносную
лёгкасьць быцьця

Талінская галубка

талінская галубка
жыве на царкве Олевістэ
зь якой у яснае надвор’е
пасьля пляшкі лікёру «Vana Tallinn»
добра відаць Беларусь
асабліва Полацак
ажно да кавярні «Даміян»
з мачанкаю на стале
праўда потым баліць галава
за ўсё трэба плаціць

гэта я размаўляю
з талінскай галубкаю
яна даведваецца што
іхняе сыбэр
па-нашаму будзе сябар
а як па-іхняму сяброўка
трэба ўдакладніць
зрэшты ня так істотна
жанчына можа быць
ня толькі сяброўкай
але і сябрам

а вось підар па-эстонску
значыць зусім іншае
аднак расейскія турысты
не гавораць па-эстонску
слушай пидор
кажа адзін свайму спадарожніку
ты едал голубей?
сам ты пидор
вот и голубей
дасьціпна адказвае другі

талінская галубка
крыху разумее па-расейску

ў яе ў вачах
успыхвае трывога
я раблю знак
каб яна не баялася
разам нас таксама двое
галубка не зусім давярае і
прабачліва міргнуўшы
адлятае
гатэль Мэрытон 402
пасьпяваю я крыкнуць наўздагон

ты это кому?
пагрозьліва пытаецца аматар галубоў
у яго на вуснах круціцца *пидор*
ты что не местный?
галубка лётае над намі
але што яна можа зрабіць
хіба адно тое што робіць:
капае на галаву аматару галубоў
вот блядь
у них даже птицы русских не любят
я адступаю да вітых сходаў
на іх можна адбараніцца
ад цэлай зграі
турыстаў з братняй краіны

па дарозе ў гатэль
шанцуе вывучыць яшчэ адно
вельмі патрэбнае эстонскае слова
terviseks
як ні дзіўна
ніякі гэта ня сэкс а тое што па-нашаму
будзьма!

талінская галубка
чакае на падвоканьні
чысьціць пёркі
вострыць дзюбку
разводзіць крылы

я адчыняю вакно
у мяне ёсьць
хлеб сыр віно
дзьве шклянкі
яна адмаўляецца ад віна
пагаджаецца на сыр з хлебам
terviseks!

я маю
два ложкі
душ
shower тлумачу я па-ангельску
шэсьць ручнікоў
сушылку для валасоў
і пёраў
terviseks!
я маю
тэлевізар
пяцьдзясят каналаў
можам глядзець эстонскія
напрыклад гэты фільм
пра гарадзкіх катоў
пра катоў ёй не падабаецца
няўжо эстонскія каты
ядуць эстонскіх галубак?
terviseks!

эстонскі сыбэр казаў што
terviseks трэба вымаўляць хутка
безь пярэрваў
іначай атрымаецца нешта
сапраўды пра сэкс

а чаму б не паспрабаваць?
спачатку адажыё
tervi-seks
а цяпер алегра
terviseks!

пляшак таксама дзьве

яшчэ ў мяне ў нумары
ёсьць інтэрнэт
вось мой адрас
а як там у вас з галубінаю поштай?
terviseks!

ня трэба так дакорліва
хітаць шызай галоўкаю
з бэзавым каўнерыкам
давай лепей пагаворым
пра Эдгара Алана По
між іншага я адзначаю
ягоныя дні народзінаў
нядаўна мэтру споўнілася дзьвесце
да яго таксама прылятала птушка
толькі вялікая й чорная
карацей крумкач
змрачнюга й жахальнік
сядзеў на пагрудзьдзі Паляды
ды крумкаў зараза:
nevermore!
do you understand my darling?
terviseks!

ты магла б мне сказаць:
forever
ці прынамсі
sometimes
а ты дакорліва хітаеш
шызай галоўкаю

я ўбачу твае вочкі
на дне апошняе шклянкі
terviseks!

слухай а як цябе клічуць?
я Ўладзімер
лепей Уладзя
скарочана Ула
так мяне кліча адзін чалавек

там дзе ядуць мачанку
а цябе мне хочацца назваць
Таля
ад імя твайго гораду
ці яшчэ ад якога-небудзь імя
скарочана будзе
Та

аднекуль пачынае гучаць
Summertime
ў выкананьні Элы Фіцджэралд
заябацельская рэч
відаць ты ўмкнула MTV
а хто ўмкнуў расейскіх турыстаў?
открывай пидор
зараз я ім пакажу
хто тут підар
здаецца па-эстонску
прыкладна так вымаўляецца алень
часам мне маніцца
ператварыцца акурат у яго
але сёньня — толькі ў голуба
открывай пидор
зараз адчыню
нас жа двое праўда?
хаця б sometimes
terviseks!

Вам сьнілася?

вам сьнілася
што вы — інкунабула
з прадмоваю на лаціне
і ломкімі старонкамі на забытай мове?

вам сьнілася
што вы — студня
ў якой удзень сьвецяць зоркі
а ўначы ўзыходзіць сонца
й плывуць па небе
бухматыя аблокі з сухой воўны?

вам сьнілася
што вы — мост
падобны да Карлавага ў Празе
або да мосту
зь нечага вандроўнага сну?

вам сьнілася
што хтосьці знаёмы
ідзе па гэтым мосьце
спыняецца паслухаць джазавы аркестрык
пазіруе нецьвярозаму мастаку
разьлічваецца
пакідае яму партрэт з аўтографам
аўтару ад арыгінала
не падае жабраку
выбірае смарагдавыя завушніцы
для зеленавокай жанчыны што засталася
чытаць на прыбярэжнай лавачцы
(здаецца Г. Мілера а можа і А. Хадановіча)

ідзе
просіць келіх чырвонага чылійскага
(здаецца тарапакі)
у кавярні пры самай вадзе
аддае астатнія грошы

на гасьцінец юнай кельнэрцы

а на стале пры вакне
кніга з прадмоваю на лаціне
а за вакном зусім побач
сузор’е што апоўдні ўзыходзіць у студні
а проста за парогам туманлівая плынь
якая адносіць мост
з аркестрыкамі й мастакамі
жабракамі й турыстамі
з гатычнымі скульптурамі
з усімі пасажырамі
ўсё далей ад лавачкі дзе зеленавокая
яшчэ чакае смарагдавыя завушніцы

Карэктура

зноў вычытваю
карэктуру твайго цела

тэкст
штораз зьлёгку іначыцца
зьдзіўляючы
сьвежымі сэнсамі
рухомай пунктуацыі радзімак
неспадзяванай зноскаю
новай папілёмкі
адсутным учора курсівам
незнаёмай парфумы

чытаю
вейкі
вочы
вусны
даю падзагалоўкі
дзьвюм ружовым паўкулям
з сакаўным двукроп’ем
дзе бясконца пераліваюцца
водары й смакі
шыпшыны
глогу
ажыны
райскіх яблычкаў
дурніцаў

чытаю радок за радком
уважліва
пяшчотна
бесцырымонна
нахабна
няўпэўнена
радасна
каб урэшце

ўвайсьці ў падтэкст
кінуцца ў яго плынь
плысьці супроць яе
мяняючы стылі
выкіроўваючыся на строму
адпачываючы ў завоінах
даючы нырца
захлынаючыся
глыбінёю
асалодаю
нечалавечай самотаю
дыханьнем вечнасьці
набліжаючыся да
кропкі невяртаньня
чакаючы хвалю якая
падхопіць мяне і

аглухлы
выснажаны
бязважкі
я апынуся на высьпе
населенай мной і табою
дзе ўжо ты
будзеш чытаць
карэктуру майго цела
шэпчучы нешта пра
двухтомнік нашага выбранага
рэдактарку пасьля якой
немагчыма нічога паправіць
молячы
як мага даўжэй
не ператварацца
ў кнігу

11 дзён

усьмешка ад вушка да вушка
першая кава ўдваіх
акторства ў ролях саміх сябе

так блізка было ўжо
да цёплых бэрак
у кроне швэдрыка
да шчасьця спалоханага ложка
да кармінавай мятлушкі
майточкаў на сьвяцільні
да кучаравых плавачак
паміж нагамі жанчыны
і целам малалеткі
да купэ ў ваколіцах Пампэяў
яшчэ не накрытых попелам
да крылатага сну
на вастрыі пляча
ў маршрутцы нявызначанага маршруту

потым званкі
раз на тыдзень
на месяц
на год

ці можна быць
самым дарагім чалавекам
толькі 11 дзён?
аказваецца можна

Ня ведаў

ня ведаў
да адной зімовае ночы
што ў маім Полацку
ёсьць старадаўнія кварталы
і цэлыя вуліцы
куды не трапляюць турысты
і нават месьцічы
калі ня знаюцца ў адмысловых
перамеценых завірухаю сьцежках

ня ведаў
да адной вясновае ночы
што мой родны завулак
з козамі і дзьмухаўцамі
выводзіць на барокавы пляц з ратушай
якога няма ў турыстычных даведніках

ня ведаў
да адной летняе ночы
што за вайсковым гарадком
разьлёгся прыцемны сад
вартаваны совамі
і змрачнаватымі скульптурамі
што ўпотай мяняюцца месцамі
зацята адводзячы позіркі

ня ведаў
да адной восеньскае ночы
што за Дзьвіною ёсьць
аточанае ніцымі вербамі возера
якога ня знойдзеш
пайшоўшы цераз мост —
адно тады калі цябе
пераправіць на чаўне
негаваркі перавозьнік
з акулярыстай вужакаю на карме

ня ведаў
да ўчарашняе ночы
што каля ратушы
адчынілі кавярню
дзе можна пакаштаваць
адвечных полацкіх страваў
ад халоднае бульбы
з брусьніцавым сочывам
да гарачых сырных пальчыкаў
што апякаюць паднябеньне

цяпер ведаю і
чакаю ліста ад жанчыны
зь якой пазнаёміўся ўчора
ў кавярні
пешчу на вуснах
яе вішнёвы пацалунак
хаджу да вечара
з апечаным паднябеньнем

Дзень сьвятога Валянціна ў Вільні

у Вільні
на дзень сьвятога Валянціна
шукаю ў каго закахацца

у хударлявую вязаную котачку
з сувэнірнае крамы?
у юную манашку
што саромеецца галінкі мімозы
ў пасінелай руцэ?
(які сюжэт зьнікае
зь яе хуткімі крокамі!)
у італійскую турыстку
зь невераемна лазуркавымі вачыма і
антрацытавай каронаю валасоў?
(што яна фарбуе: вочы ці валасы?)
у пляшку медавухі-сукцінісу?
у Маці Божую Вастрабрамскую?
(даруй Госпадзе!)

палявыя дасьледаваньні
прыводзяць на мост цераз Вялейку
за касьцёлам Сьвятой Ганны
на парэнчах сотні замкоў
кожны замкнёны
на сваю таямніцу
за ўсё жыцьцё столькі ня ўбачыш

замочак-лілея замок-
брама
(напэўна ў сад асалоды)
замок-фаляс з усім прычындальлем
(што безь яго рабіць у тым садзе?)

замок-тварык
з роцікам-адтулінай да ключа

замок-дупця

(памаўчым ужо пра іншыя адтуліны)
замок-сэрца
насамрэч яно не такое
прынамсі маё
падобнае да васьмінога з мацунамі
сам бачыў на маніторы
калі рабілі апэрацыю

на кожным замку па два імені
мужчынскае й жаночае
пераважае лацініца
раз-пораз вытыркаецца кірыліца
у тым ліку беларуская
ёсьць герогліфы
грузінская вязь
Божа!
колькі ў навакольлі закаханых!
гэта грэе лепей за сукцініс

калі ўчытацца ў замкі
сёе-тое даведаесься
вось два жаночыя імені
Яніна й Альдона
а вось Яцак і Ярык
побач тры імені
прычым толькі адно жаночае
а тут наадварот
адно мужчынскае затое тры жаночыя
(трымайся Алекс!)
страшна падумаць што там у герогліфах
і па-грузінску
o tempora o mores!

якія цнатлівыя замкі
з адным-аднюткім імем!
іх пачапілі
яшчэ адзін Алекс
(а мо той самы на адпачынку?)
мой аднайменьнік
зацяты апалягет лацінкі Vova

Нона (гэта ў яе замок-задніца)
Анджаліка (праз «д»)
вось і ўсе

на маёй валізцы
ажно два замочкі
ня богведама што
ні сэрцаў ні дупцяў
аднак можна надрапаць
колькі літар сьцізорыкам

але
каб напісаць сваё імя
трэба любіць прынамсі сябе
сёньня я не люблю сябе
мабыць за тое што
не люблю наогул нікога
дакладней не кахаю
яно страшней чым
калі ніхто не кахае цябе
няўжо дактары пашкодзілі судзінку
адказную за каханьне?
хірург-кардыёляг супакойваў:
цяпер рэнэсанс
потым будзе барока
(гэта я падараваў яму сваю кніжку)

адзін замочак
застанецца ў Вільні
грэцца паміж Янінаю й Альдонай
ды Яцакам зь Ярыкам
другі прымкну
на мосьце цераз Палату
паміж Сьвятой Сафіяй
і ціхім Запалоцьцем
шырока раскіну я нерат
пісаў калега які
даўно рыбаліць у нябесных азёрах

ці ёсьць у іх там дзень закаханых?

думаю ў Вільні
на дзень сьвятога Валянціна
на мосьце
паміж Ужупісам[1] і Запалоцьцем
паміж рэнэсансам і барока
паміж мной і табой

1Ужупіс — Зарэчча (літ.).

Астатняе каханьне дзядулі Хведара

дзядуля Хведар
85
арытмія
стэнакардыя
трэці інфаркт

дзядуля
забывае памыцца
выпіць лекі
змыць у прыбіральні
прагна есьць нешта нясьвежае
з бальнічнай тумбачкі
баіцца нашага восьмага паверху

дзядуля
трохі ўмее чытаць
скончыў дзьве клясы ў вайну
беларускую школку спалілі партызаны
юную настаўніцу дружна згвалцілі
і расстралялі
пачаліся вечныя вакацыі

дзядуля
чытае па складах
пакінуты некім глянцавы часопіс
чытае з дня ў дзень на адной старонцы
там Тына Тэрнэр
на поўны рост
у міні
мікрафон ля вуснаў
здымак крыху зьнізу

дзядуля
ня мае расавых забабонаў
хавае часопіс пад падушку
ўмыкае ўначы лямпу
глядзіць на Тыну

лашчыць фота
каструбаватымі пальцамі

аднойчы мне сьніцца сон
у палату заходзіць спадарыня Тына
ў азонавай віхуры
ў міні
зь мікрафонам
зь целаахоўнікамі
такія целы трэба ахоўваць

прачынаюся
ад эрэкцыі
азону
бальнічнае беганіны
на вуснах у дзядулі Хведара
застыла шчасьлівая ўсьмешка
значыць Тына
сапраўды прыходзіла

Андэрсэн і ты

Андэрсэн
(той які напісаў «Дзюймовачку»
і «Брыдкае качаня»)
быў баязьліўцам і недарэкам:
жыў у страху што яго
спакусяць
атруцяць
абрабуюць

Андэрсэн
ня мог пазбыцца жуды
што будзе пахаваны жывым
(пры ложку нязьменна
ляжала цыдулка:
«насамрэч я не памёр»)
што згарыць у пажары
(з сабою заўсёды была вяроўка
каб вылезьці ў вакно)
што загіне ў марскіх хвалях
(зьвестак пра ратавальнае кола
не захавалася)

Андэрсэн
баяўся памерці ад трыхінэлёзу
адно марачы пра
залацісты кавалак сьвежаніны

Андэрсэн
ведаў што
боязь адкрытай прасторы
дактары называюць агарафобіяй

Андэрсэн
вечна пераймаўся тым што
згубіў пашпарт
дрэнна заклеіў канвэрт
пераплаціў за білет

Андэрсэн
усё жыцьцё пакутаваў што
непрыгожы
не падабаецца жанчынам
ня ведае што зь імі рабіць

Андэрсэн
памёр цнатлівым
зь ціхай радасьцю што
нарэшце вызваліўся
ад болю
ў сваіх і ў штучных зубах

ты
добра заклейваеш канвэрты
(хоць у тваёй краіне
таямніца ліставаньня
ад гэтага не залежыць)

ты
не баісься пляцаў
(нават ачэпленых спэцназам)

ты
ясі сьвініну
і вычвараючыся
аддаеш перавагу
вушам і лычыкам

ты
не баісься што цябе спакусяць

ты
ведаеш што цябе пахаваюць
надзвычай надзейна
(дакладней безнадзейна)
памерлым
і зусім не цнатлівым

цяпер зразумела
чаму ты не напісаў
ні «Сьнежнае каралевы»
ні «Новага ўбраньня караля»

Вялікадне

перад Вялікаднем
мама пякла
салодкіх птушачак
зь вясёлымі вочкамі-разынкамі

я выкалупваў вочкі
зь цёплых булачак
потым плакаў
што мае птушачкі сьляпыя
а пасьля
старанна еў гаротніц

мама казала што
птушачкам вельмі балюча
але калі ты іх зьясі
знойдуць яны свае вочкі
і — уваскрэснуць

мама, а што такое ўваскрэснуць?
а яны сынок ажывуць і
паляцяць да Божачкі

яшчэ цяпер памятаю
як шчасьліва засынаў
узброены недзіцячай ведаю:
уваскрэсьне той
каму напачатку
выкалупаюць вочкі

Кат Бальтазар

зьбіраюся пісаць
раман пра сучаснае каханьне
а бяссоннымі начамі мрояцца
часы вялікага князя і караля
Яна Сабескага і
полацкі кат Бальтазар

у юнацтве кат Бальтазар
ратаваў Эўропу ад туркаў
у бітве пад Венай
цяпер ратуе Полацак ад злачынцаў
жыве каля Чорнай рэчкі
кожнага дня ходзіць на працу
катаваць

кат Бальтазар важная пэрсона
працуе з забойцамі
ведзьмамі
блюзьнерамі
старымі
маладзенькімі
прыгожымі
страхалюднымі
Трэці Літоўскі статут
дазваляе катаваць чалавека
тройчы на дзень
вольнага часу няшмат

кат Бальтазар забівае
валачашчых сабак раз-
пораз людзей
людзі падабаюцца болей
зь імі цікава паразмаўляць

У Львове

у Львове мяне не забылі
адно старое гарышча
аўстра-вугорскай эпохі
дзьве лавачкі ў Стрыйскім парку
гатэлік з назовам «Энэй»…

гарышча ўсе мае падставы
лічыць мяне недалугам
і водгульна пасьмяяцца
з таго як я аблажаўся
ў пыльным сусьвеце ягоным

дзьве лавачкі ў стрыйскім зацішку
мяркуюць цалкам іначай
і касавурацць з павагай
таму што ў іх навакольлі
я ў фаўна ператварыўся

«Энэй» мае дзіўны характар
адбіты ў сваім басэйне
сузор’ямі Льва і Дзевы
касою Касіяпэі
й станікам без гаспадыні

маёй шапялявай гаворкі
(дзе вы былі лягапэды?)
«Під Левом» ніхто ня ўспомніць
але ўстанова «Світ кави»
мяне забыць не павінна

няможна туды бо прыносіць
і расьпіваць патаемна
з рыскім бальзамам каву
няможна і зь беларускім
хоць лепей зусім бяз кавы

прадэгуставаць гэты трунак

на зёлках маёй Айчыны
які нараджае мроі
нібыта Чарнігаў — наскі
як Вільня або Беласток

у Львове мяне не забылі
кніжка мая прадаецца
у перакладзе на мову
наведніцы сьмелай гарышча
зь якой не ўзьляцелі да зор

на шчасьце занятыя цалкам
стрыйскія лавачкі будуць
я завітаю ў «Світ кавы»
ахоўнік з пагрозай скажа
то чий усе-ткі Чернігів?

манэўры майго адступленьня
мець мэтаю будуць гарышча
нязбытнай мужчынскае ганьбы
сваю там пакіну кніжку
з e-mail’ам а раптам а раптам

Між берагамі

Ірыне

на дадзены час абанэнт недаступны
жыцьцё — наогул працэс падступны
так нібы тонеш ля самых буйкоў

сьмерць твая невялікая страта
проста мяняецца апэратар
і усё менш уваходных званкоў[2]

Сяргій Жадан

кропельніца —
вясёлая клепсыдра
з срэбнымі бурбалкамі
ня факт
што іх пускаеш ня ты

хвіліну таму
табе не дазвалялі нічога
нават не казалі
выніку футболу
раптам
дазволена амаль усё
нашы прадулі 0:2
сам ідзеш у WC
звоніш з мабільніка

напэўна ты
рэзка ачуняў
дынаміка адмоўная
супакойвае доктар

аўтограф у блянку
пра згоду на апэрацыю

2Пераклад з украінскай Андрэя Хадановіча.

мае неблагія шанцы
стаць апошнім

яшчэ дзесяць хвілінаў
пасьпець напісаць
верш
ліст
запавет?
рэанімацыя —
не натарыяльная кантора
згадваеш
імёны
абліччы
жаночых прыкметна болей
котку Басоту
котку

Полацак
возера Люхава
Прагу
мора пад Барсэлёнаю
паром празь Ля-Манш
паром

трэба распрануцца
зусім
прыйшоў на сьвет
такім самым
гэта суцяшае

хутка можаш даведацца
чаго вартыя
размовы пра той сьвет
моліся
ня хочаш
жыцьця вечнага
хочаш
таго самага цела

гутарыць зручней
калі бачыш суразмоўцу
не спыняйся
сэрца на маніторы
сутаргава ківае
плывеш
плывеш у моры
Міжземным
міжсьветным
між берагамі —
казала знаёмая паэтка

не відаць
ні паэтак
ні берагоў

мора зьліваецца зь небам
ты зьліваесься зь небам
памятаеш
табе трэба мора
плывеш
да берагоў
да паэтак

бераг
зялёная выцінанка
абрысы тваіх сяброў —
два дубы
ясень
вольха
недапалены маланкаю клён
недапалены

у зялёным сутоньні
сьвеціцца твар жанчыны
прывезла цябе ў шпіталь
прабілася на апэрацыю
толькі крыху знаёмая

падаруеш ёй
букет ружаў
колькі кветак —
на столькі гадоў
пагадзілася сэрца
колькі?
якая зязюля накувае
ў лістападзе?

голас аднекуль кажа
дваццаць сем

Размова з Стрындбэргам

у Стакгольме на вуліцы Дротнінггатан па-
наску Каралевы
проста пад нагамі растуць скрозь брук
жалезныя літары цытатаў аднаго тубыльца
што меў вясёлыя кашэчыя вусікі

з прачытанага безьліччу чаравікаў
цытатніка
запісваю ўсяго тры сказы
пераплеценыя хвастамі ды іншымі органамі
рызыкоўных асацыяцыяў і падтэкстаў

кахаць значыць даваць
маё вогнішча самае вялікае ў Швэцыі
разумны пацук мусіць мець шмат дзірак

з парога дому № 85 задаволена пазірае
паласатая рэінкарнацыя аўтара
ён жыў тут у «Блакітнай вежы»
(тады гэты эпітэт азначаў адно колер сьценаў)
кіраваў сваім «Інтымным тэатрам»
бавіўся альхіміяй ды спакушэньнем жанчын
навукамі падобнымі міжсобку бо і там і там
шукаеш філязофскі камень і вечную маладосьць

цяперашні музэй
вартуе сам уладальнік найвялікшага вогнішча
ў куртатым абліччы пагрудзьдзя
на нехлямяжым пастамэнце
нібыта сьпяшаўся сваімі рукамі
зладзіць яго зь негабляваных дошак
перад нечаканым сыходам

гаспадар улешчана слухае
што ягоныя карціны
прадаюцца за шалёныя грошы

юрліва разглядвае
ножкі юных экскурсаводак і наведніц
падазрона касавурыцца на маю бараду

застаўшыся зь ім сам-насам я
адрэкамэндоўваюся
кладу на пастамэнт візытоўку з «Пагоняй»
дадаю што меў дачыненьне да
беларускага «Эрыка XIV»

выяўляючы пэўную абазнанасьць
або інтуіцыю
ён кажа што ў 1948-м у Польшчы
забаранілі ўсе пастаноўкі ягонага «Бацькі»
празь пяцьдзясят гадоў
падхопліваю я
арыштавалі маю дзіцячую кніжку
а самога звольнілі за выпуск исторической
и другой сомнительной литературы
(канец цытаты)
затое палякі нічога не забаранялі і
паставілі мне ў пашпарт шэнгенскую візу

а ў мяне ніколі не было ніякага пашпарту
ганарліва адзываецца ўладальнік шматлікіх дзірак
дадаючы што
ў апошні дзень нараджэньня ўзімку 1912-га
пад гэтымі вокнамі прайшло 15 тысяч
ягоных прыхільнікаў
не ўдакладняючы што
дэманстрацыю арганізавалі прафсаюзы

буду задаволены проста пятнаццацьцю
з выклікам адказваю я
(хоць думаю чалавек пра 150)
удакладняючы што
даўно выгнаны з прафсаюзу
з прычыны зламыснай няплаты складак

ты ўяўляеш? 15 тысяч
фамільярна падрахоўвае ён размову
пераводзячы позірк на танклявую мулатку
з «Споведзьдзю вар’ята» пад пашкай
змушаючы мяне разьвітацца
зларадным абяцаньнем
склеіць шакалядавую экскурсантку якой
натхняючыся цытатамі з Дротнінггатан
буду цытаваць
крыху адрэдагаванага для такога выпадку
айчыннага клясыка
маўляў хацеў бы спаткацца з вамі
зусім не на вуліцы
чаму б у нейкай зацішнай мясьцінцы
нам не стварыць свой уласны
інтымны тэатар?

Брат Ільля

сусед па палаце
праваслаўны манах
утульны акулярысты мядзьведзь
прасьветлены ісьціннай верай

прапаведуе слова Божае
штораніцы апавядае пра старца
якому дзікі казёл
спусьціўшыся з гораў цалаваў руку
ведае што
нельга трымаць удома катоў і сабак
беларускую мову прыдумалі антыхрысты
да рэвалюцыі продкі размаўлялі
па-царкоўнаславянску
памерці — шчасьце
усе каталікі ў пекле
папа Ян Павэл ІІ
у самым страшным агні

ляжыць брат Ільля
прасьветлены
як кавалак бурштыну сонечным промнем
ратуе нашы душы
ад аблуды

Барсэлёна

калі добра прыгледзецца
вакол сьпічакоў сабору Саграда Фамілья
як і над вежамі Полацкай Сафіі
амаль заўсёды ўбачыш анёлаў
бывае зьлятуцца дзясяткі тры
гэткі маленькі белы рой
адно што не гудзе
а можа проста не чуваць зьнізу

анёлы не карыстаюцца парасонамі
у дождж іхнія крылы намакаюць
анёлы апускаюцца на дол
таўсматыя хутчэй
тыя што трымаюцца гіпахалестэрынавай
або яшчэ якой-небудзь дыеты
мякка плянуюць

кранууўшыся зямлі
анёлы адразу перакідаюцца
ў мінакоў
будаўнікоў сабору
турыстаў экскурсаводаў
гавораць па-каталёнску
а таксама на розных іншых мовах
зь імі можна пазнаёміцца
выпіць вінчыку
зьесьці ў кавярні паэлью
паразважаць
калі Каталёнія стане незалежнай
кім быў Антоніё Гаўдзі
архітэктарам або скульптарам
калі дабудуюць Саграду Фамілью

ды прыбяруць пад’ёмныя краны
што пнуцца да Бога
навыперадкі зь вежамі
ужо задралі

адзін з анёлаў
ператвараецца ў чалавека
падобнага да недагледжанага анёла
амаль абадранца
з запаленымі вачыма
ў зьбітых чаравіках
зь дзірчастым парасонам

абадранец падазрона доўга
круціцца вакол сабору
пры гэтым не жабруе
не чапляецца да экскурсантаў
заводзіць размовы выключна з будаўнікамі
адмаўляецца гаварыць па-гішпанску
выходзіць на бульвар Рамбляс
абыякава глядзіць на кумпякі
ў вітрыне мясной крамы
купляе булку
пакет малака
пару зялёных яблыкаў
панічна баіцца трамваяў
кіруе да парку Гуэль

у парку абадранец уладкоўваецца
на неабсяжнай лаве
над Заляю ста калёнаў
(насамрэч іх восемдзесят шэсьць
але якая розьніца калі ты геній)
сушыць парасон
п’е малако з булкай
крышыць яе белым галубам

шкада што ня ведаеш каталёнскай
зрэшты анёлы павінны разумець па-нашаму
магчыма там у іх нават ёсьць
беларускія школы ці прынамсі курсы
але запытацца ты хочаш не пра гэта
ты хочаш запытацца
калі ўсё ж дабудуюць Саграду Фамілью

Бог мусіць ведаць
раптам недзе прагаварыўся
абадранец рагоча
прапануе табе малака
прамаўляе скрозь сьмех
ты раптам пачынаеш разумець па-каталёнску:
прычым тут Бог
будоўля завершыцца
калі анёлы развучацца лётаць

у ягонага малака смак абсэнту
цікава які смак у булкі?

Чаму ты не пазваніў маме?

у начным аўтобусе
паміж Менскам і Вільняй
на небясьпечнай мяжы
явы й сну
які любіць глядзецца
ў люстэрка дзе
сьцьвярджаў Авідый
хаваецца сьмерць
мне прымроіўся тэлефон
зь якога можна пазваніць
тым хто ўжо не пазвоніць табе

званкоў толькі тры
і ты
мусіш зрабіць
імгненны выбар

у таты я запытаўся
пра незнаёмую заплаканую жанчыну
якую сустрэў у шпіталі
пры ягоным ложку
калі ў таты заставаліся жывыя
адны толькі вочы

у Купалы я запытаўся
пра жанчыну якая сьмяялася
ў ягоным нумары
ў той вечар калі яго забівалі
ў маскоўскім гатэлі

у Борхэса я запытаўся
пра жанчынаў
якія дзялілі зь ім
ягоную бясконцую цемру

памежнік запытаўся пашпарт
якраз калі я

прасіў дзявочы голас у слухаўцы
злучыць мяне
з Станіславам Аўгустам Панятоўскім
каб запытацца пра
каранаваную жанчыну
якая ператварыла ягоны трон
ва ўнітаз і
дзявочы голас адказаў
што я вычарпаў
колькасьць званкоў

забіраючы пашпарт
я сьцяўся ад думкі
што там будзе штамп
ЧАМУ ТЫ НЕ ПАЗВАНІЎ
МАМЕ?

Мёд

на цёплым серабрыстым бервяне
ў высокай траве
за бабулінай хатай
ямо сьвежы мёд з хлебам
я
Вова Патоцкі
Вова Таньчын
ды Нінка Тузава

мёд яшчэ не куплёны
хлеб яшчэ пякуць у печы
мне дванаццаць гадоў
Нінцы на год болей
Вовам па чатырнаццаць
нашая сьмерць
яшчэ не нарадзілася

у Вовы Патоцкага чорная галава
кажуць прабабка
саграшыла з цыганом
акурат як мая
Вова мне нібы брат
хоць у мяне галава рудая
карацей мы паважаем цыганоў
магчыма як вырасьцем
будзем красьці коней

Нінка ўсё перасаджваецца
паміж трыма Вовамі
круціцца загадвае жаданьні
ведаем мы твае жаданьні
кажа Вова Таньчын
мы таксама ведаем

хлеб яшчэ не астылы
мёд у белай талерцы
з арлом і свастыкай

малако ў парцалянавых кубках
таксама белых
таксама з арлом і свастыкай
бабуліна памяць пра немца Паўля

мёд крапае на Нінчыны грудзі
цячэ па равочку ніжэй
у ейныя таямніцы
вучоныя яшчэ не адкрылі што
рэгулярна назіраючы жаночыя грудзі
пажадана аголеныя
пажадана вялікія
значна менш рызыкуеш адхапіць
інфаркт ці інсульт

апрача таго любаваньне грудзямі
павялічвае працягласьць жыцьця
мужчыны
ў сярэднім на чатыры-пяць гадоў
наконт уплыву згаданага сродку
на жыцьцё ўладальніц грудзей
зьвестак няма
трэба вылучаць гэтых вучоных
на Нобэлеўскую прэмію

я пазнаёмлюся зь іхнім адкрыцьцём
ужо ў іншым стагодзьдзі
але інтуітыўна
яшчэ там на бервяне
хачу працягнуць жыцьцё
такім дзівосным чынам

ямо мёд з хлебам
хутка зьявяцца першыя гуркі
Вова Таньчын будзе даводзіць Нінку
што яна любіць больш
гуркі ці памідоры

мы ўжо каштавалі

крадзеныя ў лаўцы падушачкі
самагонку
папяросы «Беламорканал»
паўночную вусьціш на могілках
бабулін пранік
а колькі яшчэ пакаштуем

праз год пасьля таго мёду
Нінка спакусіць мяне ў лазьні
сьцягне праз голаў сукенку
скажа зь нявіннай усьмешкай
пастаў мне палку
у мяне атрымаецца цэлых дзьве

праз трыццаць пяць гадоў
пасьля таго мёду
Нінка памрэ ад раку грудзей
пасьпеўшы на чатыры-пяць гадоў
павялічыць жыцьцё
некалькім
а можа некалькім дзясяткам
а можа некалькім сотням
мужчынаў
грудзі былі сапраўды рэдкія

празь пяць гадоў пасьля таго мёду
Вова Патоцкі паступіць у інстытут
на апошнім курсе пачне пісаць вершы
будзе чытаць мне іх у піўбары

потым Вова Патоцкі
паступіць у асьпірантуру
і аднойчы
выйдзе ў вакно з інтэрнацкага пакою
на адзінаццатым паверсе
ня вытрываў гэтага сьвету
альбо таго што адкрываўся яму
на адлегласьці імгненьня
зрабіўшы зусім белай

маладую цыганскую галаву
так і ня ўкралі зь ім аніводнага каня

празь дзесяць гадоў пасьля таго мёду
Вова Таньчын ня будзе
пісаць і чытаць вершаў
будзе чытаць
пераважна налепкі на пляшках
стане клясычным альканаўтам

на дваццаць пятым годзе
жыцьцё Вовы Таньчынага
замерзьне ўзімку пад матчыным плотам
Танька будзе галасіць
каб сына не хавалі а
паклалі ёй у лядоўню

праз сорак тры гады пасьля таго мёду
ў мяне здарыцца інфаркт
відаць замала глядзеў
на жаночыя грудзі
зрэшты дастаткова каб
выжыць
купіць квіток

прыехаць
прайсьці пад дажджом
шэсьць кілямэтраў ад станцыі
знайсьці збуцьвелае бервяно
дастаць з заплечніка
белы кубак з арлом і свастыкай
выпіць зь яго ўдвая болей
дазволенай дактарамі дозы

Вова Патоцкі меў рацыю
усяго на адлегласьці імгненьня
мы
на цёплым серабрыстым бервяне
ў высокай траве

за бабулінай хатай
ямо сьвежы мёд з хлебам

чмель павялічвае сваё жыцьцё
лётаючы вакол Нінчыных грудзей
Воваў зноў трое
у аднаго галава чорная
у другога цьвярозая
у трэцяга кружыцца як зірне на Нінку
у штоніках нешта варушыцца

Нінка круціцца паміж намі
загадваючы жаданьні
Вова Таньчын выконвае іх у адрыне
на старым драўляным ложку
можа якраз там мая прабабка...
Вова Патоцкі
чытае нам вершы

а можа побач з намі іншы сьвет
у часе на адлегласьці імгненьня
і можа іншы ты у ім жывеш
і можа й цябе чыстае сумленьне

На Готляндзе

на Готляндзе мне сьніцца востраў Полацк
пакінуўшы Айчыны мацярык
плыве ён у нясьпешлівым Гальфстрыме
маіх гадоў падзеленых з самотай

то з вышыні крыла з падбоем сінім
то асядлаўшы калываcты плот
гляджу на дом і сад стары зьдзічэлы
куды зайцы завітвалі на моркву

каб абабегчы сьцежкаю шэсьць вокнаў
патрэбна босым ножкам адпачыць
найлепей дзе жыве мая стакротка
ў маленькай хатцы са страхой з травінак

яшчэ няма ні здрадаў ні каханьняў
і неўміручыя яшчэ бацькі
якіх засьпеў аднойчы ў ложку зраньня
ў занятку дзіўным… год празь дзесяць толькі

я зразумею што паспаўшы болей
тым днём дажджлівым мог бы атрымаць
сястрычку зноўку ці малога брата
зь якім хадзіў бы разам падзівіцца

на дзецюкоў што брук кладуць да пляцу
вясёлы кожны і нібы мурын
ад сонца чорны… брукаванка ляжа
да храму Стэфана які спыніўся

каменным галіёнам па-над местам
а там увішныя дзядзькі кладуць
у алтары й на хоры выбухоўку
каб замаўчаў гадзіньнік старасьвецкі

які зацята час лічыў па-свойму

на Готляндзе мне сьніцца Полацк мой
хаваюць тату мушка на фіранцы
ў жалобе сьціхла... я ж так нецярпліва

чакаю ўжо: ці праўда ён пазвоніць
на дзень маіх народзін як сказаў?
бяжыць насустрач рыжая дзяўчынка
ляціць адтуль адкуль не дазваніцца

за ёю коціцца зялёны ровар
пусты хоць круціць нехта панажы
сасі банан трапічаскага лесу
злавесна цэдзіць мой сусед-аторва

у рыжую таксама закаханы
ля крамы сварыцца чарга па хлеб
вясёлка бруку зьзяе з-пад асфальту
а наша Дзьвінка як Дзьвіну мы звалі

цячэ ў сутоньні ранішнім у мора
далей на Готлянд проста ў сноў вітраж
дзе дом на скалах над гатычнай кірхай
дзе з мэзаніну дэндзі мармуровы

ў капелюшы сьціхотліва знаёмым
шматзначна па-сяброўску падміргне
з таго ня менш рэальнага сусьвету
там ружы на Каляды зацьвітаюць

там вокны як музэйныя вітрыны
што вечар ператворыць у вяртэп
з караблікамі дамамі чарцямі
жыцьця свайго павольнаю прасторай

дзе некалі і я знайдуся можа
нацубіўшы зялёны капялюш
міргну камусьці ўсьцешна з мэзаніну...
у Полацку мне сьніцца востраў Готлянд

У букініста

калі кнігі даведваюцца
што трапяць у букіністычную краму
яны паводзяцца па-рознаму
адны роспачна точацца ў другі шэраг
другія вытыркаюць забытыя закладкі
каб паказаць што яшчэ патрэбныя
трэція знаходзяць для цябе
паміж забытых старонак
інтымны ліст
ці прыхаваную купюру

толькі кнігі
якія напісаў ты сам
ганарліва касавурачыся
на тамы нобэлеўскіх ляўрэатаў
пачатку мінулага стагодзьдзя
і нават на трохвекавыя рарытэты
а таксама адна на адну
чуюцца ў небясьпецы

ім здаецца
што пакуль ты жывы
іхні гаспадар ня зьменіцца
а можа і пазьней
не давядзецца мяняць
утульнага месца
на пыльнай палічцы за фатаздымкамі
бо гаспадар
добра выхоўваў нашчадкаў

наіўныя! сёньня
томікі з гэтай паліцы
я занясу знаёмаму букіністу
каб зьбіць зь іх фанабэрыю

каб паназіраць
як яны будуць пачувацца

ў кампаніі з сваімі блізьнятамі
што ўжо здадзеныя ў краму
маімі сябрамі якім некалі
напісаў на тытуле
колькі прачулых словаў

каб мае кнігі
былі ў роўных умовах
на разьвітаньне я таксама
пакіну на іх аўтографы —
самому сабе

Мае самагубствы

чалавецтва падзяляецца на
тых каго наведвала думка пра самагубства
тых да каго яна яшчэ завітае
тых хто зь ёю так і не сустрэнецца
апошнім ніколі не зайздросьціў
Аўтар

першы раз
я меўся зьвесьці падрахункі з жыцьцём
як мне споўнілася сем гадоў
а бацькі не падаравалі сыночку ровар

сцэнар быў бліскучы
пайсьці ўвечары ў задзьвінскі лес
каб тамтэйшыя ваўкі
са смакам зьелі мяне да белых костачак
якія мама зьбярэ ў кашолку
а тата завязе на могілкі ў маленькай труне
на навюткім ровары
ваўкі не ўхвалілі задумку
апоўначы тата знайшоў мяне ў лесе
ўначы адлупцаваў
сваёй пракурорскай папругай
ўраньні купіў ровар
зваліўшыся зь якога праз тыдзень
я зламаў руку і болей ніколі
на яго не садзіўся
так дагэтуль і ня ўмею езьдзіць

другі раз
я самахоць сабраўся памяняць сьвет
адсьвяткаваўшы пяцьдзясят
прычыны доўга тлумачыць
але яны былі важкія

хацелася быць арыгінальным аднак
амаль усё выглядала плягіятам
Сакрат пасьпеў выпіць цыкуту
Сэнэка — намацаць найлепшыя жылы
Грабал — выпадкова выпасьці з вакна
закаханая (не ў мяне) знаёмая —
залезьці на дах дванаццаціпавярховіка і
зрабіць упэўнены крок насустрач
ранішняму сонцу

мяне вабіла водная стыхія
Дзьвіна выглядала спакусьлівай але
ласкавая плынь магла па знаёмстве
аднесьці занадта далёка
між тым трэба было паклапаціцца
пра пахавальную працэсію
якая мусіць за нечым ісьці

выбар быў зроблены на карысьць
азёрнай затокі
млявы плёс атрымліваў магчымасьць
палюляць разам зь лілеямі й мяне
утульна заблытаўшыся ў сьцяблінах
зь якіх дзяўчаткі робяць пацеркі
я чакаў бы сваіх вызваліцеляў
і дух мой ганяўся б над вадою
за самотнаю чапляй ды
віхлястым і бялявым
пялёсткам белым — матыльком
(жывы клясык ацаніў бы мой сыход
каскадам новых алітэрацыяў)

плян быў прадуманы да драбніцаў
Харон адпачываў
човен напракат каштаваў 5 тысяч
беларускіх рублёў за гадзіну
плюс пашпарт у заклад
туды зручна было пакласьці
цыдулку з апошнімі наказамі
пашпарт забіраў Вася

ягоную жанчыну клікалі Таня
яны жылі пры возеры
глядзелі за саўнай і трэнажорнай заляй
у меру выпівалі
былі загарэлыя й маладыя

генэральная рэпэтыцыя
была прызначаная на пятніцу
Вася з Таняй
прыбіраліся ў саўне й вырашылі што
гэты куток радзімы зусім някепскі для
самі разумееце чаго

сонца было зь імі ў змове
бітлы таксама
Пол так сьпяваў *Let It Be*
што парачка шэрых чапляў
зрабіла плаўны разварот і вярнулася
я нячутна прычыніў дзьверы й падумаў
пайшло яно на...
гэтае самагубства

Польскі транзыт

Вілі

як клясна ехаць па Польшчы
глядзець на лясы і касьцёлы
цешыцца квеценьню вішняў
і вершык хмельны складаць

як клясна ехаць па Польшчы
ведаць што заўтра Радзіма
што вочы яе і лоні
будуць маімі навек

як клясна ехаць па Польшчы
піць вінчык нямецкі з шынкай
фліртуючы з правадніцай
табе sms'кі кідаць

як клясна ехаць па Польшчы
і сумаваць па нязбытным
палаяцца з пасажырам
з вагону «Бэрлін — Масква»

сказаць што мы не Расея
і што ідзіце вы ў сраку

як клясна ехаць па Польшчы
трэба вось толькі забыцца
адну жыхарку Кракова
Кракава па-беларуску

яна ў лісьце напісала
што нігды ня будзе тваёй
хоць плач хоць страляйся нігды
ідзі карацей у дупу

як клясна ехаць па Польшчы
сьмяяцца касіць пад блазна

даць парню з Выбаргу ў пысу
у міжэтнічным канфлікце

як клясна ехаць па Польшчы
з вакна вытыркацца ўвечар
і забывацца старанна
тую што проста прыдумаў

Чытаў свае вершы

чытаў свае вершы
пахмурным клясыкам
што злосна глядзелі
зь бібліятэчных партрэтаў
быццам ня даў ім пахмяліцца

чытаў свае вершы
галодным студэнтам
у аўдыторыі дзе на галёрцы
вэрлібр пайшоў упрыкуску зь мінэтам

чытаў свае вершы
футбольнаму фанату з шатляндыі
што ганарліва ўваліўся
ў купэ варшаўскага цягніка
ў пакамечанай спадніцы і
з шыкоўным засмоктам на шыі

чытаў свае вершы
эбанітавай стрыптызэрцы з Кліўлэнду
штат Агаё
зь якой у мяне нічога не было
калі не лічыць дзесяці баксаў
заторкнутых за гумку
карункавай белай панчошкі
што пазначала ў цемрыве
нашыя каардынаты быцьця

чытаў свае вершы
духмянаму як камамбэр
парыскаму кляшару
які на адвітаньне спрабаваў рэквізаваць
маю родную пляшку бардо

чытаў свае вершы
айчыннаму чырвона-зялёнаму чыюку
якога гаспадар навучыў брыдка лаяцца

на сьцяг такіх самых колераў
(вядома мадагаскарскі)
а таксама выразна прамаўляць
сука дай круп
словы якімі суворая птушка
ацаніла маю дэклямацыю

чытаў свае вершы
ведаючы што адно рэпэтую
а калі нарэшце наважыўся
прачытаць іх табе
ты сказала
толькі ня гэта
і расшпіліла першы гузік на маёй кашулі

запытаўся
ці зрабіла б ты тое самае
калі б я не пісаў вершаў
а ты засьмяяўшыся расшпіліла мне
маланку на джынсах
запытацца ці
я ўжо не пасьпеў

Калі-небудзь усё будзе апошнім

калі-небудзь усё будзе апошнім
апошні ранішні кубак
неверагодна моцнай
кенійскай гарбаты з малаком
апошнія абдымкі жанчыны
з скураю колеру гэтай гарбаты
і апошнія жаночыя абдымкі наогул

апошняя ангіна
апошняя жменька суніцаў
з смакам тваіх смочак
апошняя гульня з сынам
у пінг-понг
апошняе нецэнзурнае слова
ў тваё пяшчотнае вушка
і апошняе слова
ў вуха Вечнасьці

апошняя напісаная кніга
і апошняя кніга якую разгарну
апошні наведнік маёй вальеры
як я называю гэтак званы кабінэт
і апошні наведнік
(лепей наведніца)
майго сэрца

апошні келіх віна
апошняя эрэкцыя
апошняя вандроўка
па тваёй салодкай вагіне

апошняя вандроўка
ў родны горад
і самая апошняя вандроўка
з большай ці меншай колькасьцю
спадарожнікаў і спадарожніц
у цёмных (але неабавязкова)

гарнітурах і сукенках
апошні электронны
ці проста ліст
які можа прыйсьці мне
або майму адрасату
калі ўжо ўладкуюся
ў сваім апошнім
транспартным сродку
дзе складана напісаць
або атрымаць адказ
нават праз e-mail...

чамусьці неадчэпна думаў
пра такія рэчы
калі яшчэ не была вынайдзеная
электронная пошта
а цяпер
штораз з большаю асалодай згадваю
як усё тое што будзе апошнім
здарылася ўпершыню

Асьвея

Асьвея
дарога ў сьвеі
ці можа якраз са сьвеяў
або да сябе самога
ці да цябе як зазвычай

Асьвея
возера ў сквары
нашая fata morgana
лайбаю на небакраі
ў чаротавых хвалях плыве

Асьвея
намёт на ўзлобку
стрэча з ваўком — маім братам
які тут мае радзіну
ваўчыцу і двух ваўчанят

Асьвея
поўнач на высьпе
поўня ў паўнюткім зацьменьні
таму й мабільная сувязь
зь Вялікай зямлёю маўчыць

Асьвея
агонь на строме
водбліз зьдзічэлага саду
нячутна выйдуць з-за яблынь
душы былых астраўлянаў

Асьвея
душы прысядуць
хто з коткаю на каленях
а хто з дварняком каля ног
босых парэпаных вечных

Асьвея

сьціхота й радасьць
мама прысьніцца пад раньне
насыпле кішэнь ірысак
прамовіць ваўчо ты Вова

Асьвея
зноўку прыеду
скочу з маторкі на бераг
чакацьме на строме брат мой
які тут жыве з радзінай

Я марыў стаць патолягаанатамам

калі я быў неўміручым
меў сонечную мару
стаць патолягаанатамам
нават навучыўся вымаўляць гэтае слова без памылак

патолягаанатамам
быў наш сусед дзядзя Жэня
вясёлы габрэй з сумнымі вачыма
мой найлепшы сябар дзяцінства
ён заўсёды пахнуў парфумаю
яна з дня ў дзень мянялася
струменячы сярод духменяў
смажанае цыбулі ды іншых цымусаў
водарамі язьміну бэзу канваліяў і нейкага шыпру
водары ў бутлiках
рабілі на засакрэчанай дзядзіжэневай працы
куды не пускалі дзяцей

калі я зрабіўся сьмяротным і
спасьціг таемную сутнасьць
запаветнай дзіцячае мары
дзядзя Жэня раскрыў мне колькі важных сакрэтаў
свайго патрэбнага людзям занятку
я даведаўся што
за дзьвярыма трупярні жыцьцё не канчаецца
некаторыя паміраюць толькі там
ад ускрыцьця
некаторыя ад ускрыцьця ўваскрасаюць
другіх болей
таму ўсім рэкамэндавана запісацца
на прыём да патолягаанатама

каб ня здарылася як з Гогалем
што ўваскрэс на пару мэтраў ніжэй чым трэба
рабі высновы сказаў дзядзя Жэня
ад’яжджаючы на гістарычную радзіму
(што ні кажыце прыемней мець справу з суайчыньнікамі)

вакантную пасаду заняў дзядзя Грыша
сумны габрэй зь вясёлымі вачыма
які пацьвердзіў што
жыцьцё доўжыцца і ў ягоных уладаньнях
за абабітымі бляхай дзьвярыма
негаваркія насельнікі
радыя ўсім наведнікам
жывым і такім як самі
апошнім болей бо
іх зьяўленьне надае астатнім аптымізму
нядаўна прыехала парачка
што кахалася ў гаражы з уключаным маторам і
мясцовая публіка адразу павесялела

дзядзя Грыша вадзіў мяне на экскурсію
ўражаньні самыя сьветлыя
паміж ягонымі пацыентамі
бываюць нават раманы бо
мужчыны і там цэняць жаночае хараство
а жанчыны мужчынскую сьмеласьць
і зусім не фрыгідныя
бачыш — паказаў дзядзя Грыша — за ноч
прафэсар пасунуўся бліжэй да студэнткі
я пераканаўся што
ў трупярні таксама можна жыць
асабліва як выжлукціш з гаспадаром
літровую пляшку ўіскі

калі я стаў пісьменьнікам
дзядзя Грыша зьехаў на гістарычную радзіму
(што ні кажыце прыемней мець справу з суайчыньнікамі)

вакантную пасаду заняў спадар Мікола
(сярод суайчыньнікаў ён мае сантымэнт да беларускамоўных)
нашчадак роду Дарагастайскіх
яны працавалі полацкімі ваяводамі
надворнымі маршалкамі
стольнікамі літоўскімі
а цяпер зарабляюць на хлеб паталягаанатамамі

крыху выпіваючы з дапытлівымі літаратарамі
што любяць забаўныя гісторыі й сюжэты
да прыкладу адзін зарэзаны бандзюган
уваскрэс уначы акурат напярэдадні Вялікадня
знайшоў на стале ў санітараў карты
ды пасадзіў рахманых суседзяў гуляць у «тысячу»
або прыехаў сваяк
а можа і сам забойца забітага
дае спадару Міколу сто баксаў з мабільнікам
ды просіць мудак
перад ускрыцьцём прывязаць мабільнік нябожчыку да рукі

наогул цяпер нярэдка перад хаўтурамі
кладуць наўцу ў кішэню тэлефон зь перадаплатай
каб у выпадку чаго пазваніў ці паслаў sms
невядома яшчэ ці кінуцца гэтыя мудакі
каго-небудзь адкопваць
мо проста хочуць пераканацца што
ўсё зроблена як мае быць і
жывы нябожчык не ўзбаламуціць вяртаньнем
набыты пасьля яго сыходу спакой

я пакуль ня вырашыў
ці браць з сабой мабілу
але дакладна ведаю што
калі за мною зачыняцца
абабітыя бляхаю дзьверы
буду не самотны
ды яшчэ атрымаю ўзнагароду
ў выглядзе сустрэчы з увасабленьнем
сваёй сонечнай мары

Мне прысьніўся Хадановіч

мне прысьніўся Хадановіч
велічны нібы сэнатар
недарэзаны Нэронам
іранічны як Свэтоній
заклапочаны як Брут
можа сам каго зарэзаў
можа вершык марыў скласьці
а магчыма проста піва
прагнуў выпіць насупроць
Камітэту дзяржбясьпекі
дзе цікавяцца здаўна
нашым паэтычным словам
і напэўна нездарма

ён ішоў па вуліцы Маркса
ў Менску стомленым і сонным
між кавярняй «Эльдарада»
і ангельскай амбасадай
(там у будцы мент сядзіць)
рухаўся накіравана
не хістаўся не губляўся
павітаўся з нарпаэтам
з рэдкім іменем на «Н»
даўганогай прыгажуні
мімаходзь прызначыў стрэлку
і сказаў бамжу «банжур»

ён ішоў... гракі крычалі
ў наваколлі Нацтэатру
(ну чаму не груганы?)
бомж чытаў паэта Ніцку
плакаў... языком мянціў

даўганогая бляндынка
набыла контрацэптыў
бо навокал СНІД лютуе
а Андрэй — за ўсіх мудрэй

я прачнуўся і падумаў
вось прысьніцца Хадановіч
цёмнай ночкай на Каляды
без усякіх там прыколаў
заклапочаны як Брут
будзе йсьці па вуліцы Маркса
з томам Малярмэ ў партфэлі
і часопісам «Arche»
і з сухім ляшчом пад пахай
што адгэтуль вынікае?
што паэту трэба муза
а часамі прагне піва
ўкрай асьмяглы арганізм
і ляшчы яшчэ вядуцца
у вірох маёй Радзімы
КДБ шануе мову
і «Arche» выходзіць спраўна
а бамжы чытаюць кнігі
знойдзеныя на памыйках
гэта значыць што пісьменства
наша краснае — жыве!

в

ваба
вабачка
вабка
вабнотка
вакханка

в*а*ва
в*а*вачка
ваўка
ваванка
вагантка

вагавінка
вагінка
вагнітка
вазёрніца
вальпургіянка

вадзяніца
вадохрыстка
в*а*дачка
в*а*да
ванзэйка

вадаліўка
важ*а*чка
валожынка
ваза
вафлістка

вадналыжніца
ватэрпалістка
валошка
валтузьніца
вануацянка

вакалістка

ванзэльніца
валейбалістка
вампірка
вандалка

валтарністка
валхвіца
валашка
ванкувэрка
вайдэлётка

валачобніца
варшавянка
варшанка
валютніца
валюнтарыстка

валавочка
вакзальніца
валенсіянка
вахцёрка
валюстаманка

валадушка
валянка
вальфрамка
ва-банкаўка
варлівочка

валынянка
ваярка
ваўчыца
вальготка
валькірыя

валянтэрка
вандроўніца
валентыянка
вавёрка

вакацыя

валянцінка
варкотка
варголка
варгатка
вальтэрыянка

вальтыжорка
вальсоўніца
валька
варгіня
ваўчынка

валміерка
вар’ятка
васалка
варажка
васпанка

варакушка
варонка
варанка
варштатка
вархольніца

вастразубка
вальжынка
вастрылка
варсінка
вальготніца

васьміножка
варожка
валэнда
валечніца
ваўкавысянка

васьміклясьніца

васілінка
ваалка
варэнька
васьміактоўка

ваўкалачка
ваўкіня
валодка
валдайка
валякардынка

веда
ведачка
веечка
ведзьма
вэлясыпэдыстка
ведрычанка
вялікадушніца
вежачка
велька
вялесьніца

велягурачка
векапомніца
веліжанка
вялікапышніца
вялікабрытанка

венцаноска
вэрм*у*тніца
вэнэсуэлька
вэнэрыянка
вялікаберастравічанка

вера
вербачка
венка
вернападданьніца
вэнэцыянка

вераемніца
верагодніца
веравызнанка
вэрб*а*лка
верхнепалеалітка

верасовачка
верасьнёвачка
велясовачка
верніца
вераадступніца

вербалозка
вэльботка
верацярпіміца
в*е*рунка
в*е*трынка

вераломніца
вэрбавальніца
вэраналка
вэрбэна
вэстыбулярка

верашчалка
вялікасьветніца
векша
вялікапакутніца
в*е*рця

верхалазка
вэронка
вэстготка
верашукальніца
вэст-індыянка

верціхвостка
вэсталка

вялікаліцьвінка
вяртэпніца
ветліца

верацэньніца
верхаводка
вэргіліянка
вэндэтка
вэрыфікатарка

вернідубка
в’етнамка
вэстэрнаманка
вэст-эндка
вэб-вумэнка

верцідупка
вятроўка
вяртушка
вярзунка
верцігалоўка

вэльзэвульвачка
вершашукальніца
вершавызнаньніца
вершніца
вэрлібрыкоска

вэраніка
вэнэра
вэнэтка
вэльвэтка
вяшчальніца

вечавальніца
вечароўніца
вечарніца
вядзьмедзіца
вялікаполька

верхнядзьвінка
вэрвольфаўка
вэрсія
вейка
вэрсыфікатарка

вівіянка
віватка
вінярніца
відзэмка
відзаўка

відавочніца
віка
вікторыя
віралеістка
вільгурка

візэруньніца
візытаманка
віёля
віжоўка
вікуньня

візытэрка
вільнянка
вільнярка
віньетка
віндсэрфінгістка

вікінгіня
вігоня
вікуша
візытніца
візіяністка

вікантэса
вігвамніца

вівальдыманка
вів*е*ра
вібрафаністка

вінаградзінка
віначэрпіца
вінаваўніца
віньнічанка
віні-пухоўка

вірлавочка
вітражніца
вішанька
вікця
вішнёўка

віртуозка
вірлівіца
вітка
віялянчэлька
віялянчэлістка

віртуалка
віроўніца
віуэлістка
вітрыньніца
вісуска

вісагінка
віхурка
віталечка
вітачка
віктарыянка

віцяблянка
віражніца
віта
віцінка
вівакубінка

віскуценьніца
віскіманачка
вівісэктарка
віталістка
віцэ-мастачка

вогнепаклоньніца
водаваротніца
войтачка
воечка
востраканфліктніца

вокамгненьніца
восьпінка
восенька
воленька
воска

вольнанаёмніца
вольхачка
волатка
ворліца
вольцця

воля
вольніца
волечка
вольвачка
вольнаадпушчанка

вуалетка
вугорка
вудыстка
вужалка
вуаерыстка

вузкаплечка
вужачка

вуалеахвостка
вульгарніца
вулька

вуркагантка
вупырка
вусатка
вучыцелька
вульванаўтка

вуніятка
вульлянка
вушатка
вучнёўка
вузкадупенцыя

вузкавочка
вузкапізьдзёнка
вудзільніца
в*у*сьцішка
вузкакалейка

выблуканка
выбранка
выбраньніца
выдра
выданьніца
выбуянка
выдранка
вырочніца
выдма
выдатніца

выбухоўка
вызнанка
вызвольніца
в*ы*струнка
вундэркідалка

выблядушка
вызволька
выспавяданка
выслоўніца
выспачка

вываланка
выведніца
вырайка
выйка
выжарынка

выдумляльніца
выжліца
выжлукта
выйгра
выкрутніца

выкапнёўка
выключніца
врачка
вынятка
высокамаралка

выкруцёлка
высмажанка
вытлумачальніца
выпраменьніца
выкрасалка

выляжанка
высмокта
выёбка
выёбніца
высакаклясьніца

вымуштроўніца
вымудроўніца

выхаваначка
вырахаваначка
вырваска

вынаходніца
выхавальніца
вырвачка
выратавальніца
выратаванка

выпястунка
вылежніца
высакалётка
вычварніца
высакавольтка

высакоўка
servicesлужніца
высакамоўніца
высакагорніца
высачка

вычварэнка
выёбушка
выебаманка
высочніца
высокачастотніца

вышаградка
вышагародка
выюрачка
выцалоўніца
высакагрудка

вярцёлка
вядзьмарка
вядунка
вяршыцелька
вязьніца

вярсталка
вястунка
вясьлярка
вясьнянка
вясельніца

вяргіня
вяскоўка
вяхірка
вялебніца
вянка

вятошка
вятружка
вяльможніца
вята
вяшчунка

в…

Ёсьць гарады прыдуманыя Богам

ёсьць гарады прыдуманыя Богам
ёсьць гарады прыдуманыя д’яблам
а хто цябе прыдумаў горад мой?

хто сьніў цябе такім якім ніколі
ты не прачнесься раніцай туманнай
каб у Дзьвіне памыць заспаны твар?

што сьнілася табе ў тваіх кашмарах
і ў прыцемным бурштынавым бяссоньні
і ў сьветлых снах што спавівае сум?

хто зь сьвечкай йшоў па гулкіх сутарэньнях
палохаючы вусьцішныя цені
ўладыкаў звар’яцелых і цароў?

хто летапіс твой скраў крывёй паліты
хто расьцягнуў тваю бібліятэку
зьвёз хто ў чужыну жыватворны крыж?

ты прышласьці званіў Сафійскім звонам
ты нашым сьніў сябе Ерусалімам
ды трэці Рым прызначыў іншы лёс

о як мне часам прагнецца ўваскрэснуць
у тагасьвеце у які ня веру
дзе містыка і тайніцы твае

са мной няхай давеку застануцца
у вандраваньнях па чыстцы і раі
а лепш усё ж па пекле: цікавей…

я не ўваскрэсну а вось ты — ўваскрэсьнеш!

Пазнаю сябе ў сыне

пазна*ю* сябе ў сыне

у почырку зь літарамі
што падхмелена танчаць
на вольным паветры

у вясёлым мітынгу
папераў і кніжак
на пісьмовым стале

у нязводнай схільнасьці
да вострага і салодкага
асабліва да эклераў

у адчуваньні словаў
на смак і колер
на водар і дотык

у медзьведзяватай хадзе
па вуліцы
па цэлым сьвеце

у захапленьні школьніцай
што яшчэ проста малая
і не разумее

у любові да лацінаамэрыканцаў
пераважна да Хуліё Картасара і
Габрыеля Гарсія Маркеса

у цыганскіх вандраваньнях
з кароткімі прыпынкамі
на палубе роднай канапы

у празе адзіноты
што сьпеліцца як папяроўка і

абрынаецца як залева

ва ўчэпістых хваробах
(дай Божа каб не ўва ўсіх)
што адкрываюць новыя сутнасьці

ва ўменьні пакрыўдзіць
пакрыўдзіцца
даравацъ

пазнаю сябе ў сыне

так хочацца пазнаць сябе і тады
калі прысяду яму на плячо
цёплым ветрам

Арлоў, У.А.

Усё па-ранейшаму толькі імёны зьмяніліся : вершы / Уладзімер Арлоў. — Мн. : Логвінаў, 2009. — 104 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»).

ISBN 978-985-6901-41-9